№№63–64
(3400–3401)

29 красавіка—5 мая 2011 г.

Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

www.nv-online.info

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

SOS!

«Народная Воля» — у небяспецы!

Калі верыць паведамленню Беларускага тэлеграфнага агенцтва, "Народную Волю" чакае чарговае выпрабаванне — *"25 апреля 2011 года поданы исковые заявления в Высший Хозяйственный суд Беларуси о прекращении выпуска газет "Наша Ніва" и "Народная Воля". Данное решение принято в соответствии с подпунктом 2.2 пункта 2 ст.51 Закона Беларуси "О средствах массовой информации" в связи с вынесением редакциям названных изданий в течение года двух и более письменных предупреждений".*

Так, за адносна кароткі час міністр інфармацыі падпісаў некалькі папярэджанняў "Народнай Волі".

Можа, "Народная Воля" займалася прапагандай вайны?

Не!

Можа, "Народная Воля" заклікала да насілля?

Не!

Можа, "Народная Воля" прапагандавала парнаграфію?

Не!

Можа, "Народная Воля" паклёпнічала на...?

Не!

Можа...

Не, не, не!

Дык што ж гэта за папярэджанні, вынесеныя Міністэрствам інфармацыі?

Пра апошняе, звязанае з публікацыяй Святланы Калінкінай, у якой яна выкарыстала метафару ў адносінах да Беларускага тэлебачання, мы пісалі ў папярэдніх нумарах. Наша касацыйная скарга на рашэнне Вышэйшага Гаспадарчага суда яшчэ не разглядалася. Наогул, судовая спрэчка паміж Белтэлерадыёкампаніяй і "Народнай Воляй" не скончана, а папярэджанне Мінінфармацыі ўжо вынесена.

А чаго варта папярэджанне за тое, што журналістка Любоў Лунёва звярнулася з пытаннем да лідара зарэгістраванай у Чэхіі грамадскай арганізацыі "Малады фронт" і той ёй адказаў? Пры гэтым да зместу слоў актывіста прэтэнзій няма.

Смехатурнымі выглядаюць і іншыя абвінавачанні "Народнай Волі" з боку Міністэрства інфармацыі. Мы лічым іх палітычна матываванымі, не даючымі падставы для звароту ў суд з іскам аб закрыцці газеты.

Скажам адкрыта: калі так тэндэнцыйна, заангажавана, непрафесійна падыходзіць, то Мінінфармацыі трэба спыніць выданне ўсіх-усіх газет — і дзяржаўных, і недзяржаўных. "Народная Воля" можа быць эталонам аб'ектыўнасці, праўдзівасці, уважанасці, плюралістычнага падыходу да асвятлення важнейшых падзей і працэсаў.

Адным словам, нам застаецца спадзявацца, што здаровы сэнс усё ж возьме верх, і справа аб спыненні выдання "Народнай Волі" не дойдзе да судовага разгляду.

Чытачоў просім не хвалявацца: у вас і ў нас дастаткова каналаў разам абмяркоўваць сітуацыю і знаходзіць выйсце. Калі раптам заўтра-паслязаўтра адбудзецца нешта надзвычайнае, сувязь трымаем праз сайт "Народнай Волі": *www.nv-online.info*. А пакуль пазнаёмцеся са зместам тэлеграмы Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнку і ліста старшыні Грамадскага каардынацыйнага савета ў сферы масавай інфармацыі пры Савеце міністраў П.І.Якубовічу.

Рэдакцыя газеты "Народная Воля".

ТЭЛЕГРАМА

Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнку А.Р.

Прашу Вас спыніць дзеянні Міністэрства інфармацыі, якія накіраваны на эскалацыю канфліктнай сітуацыі ў грамадстве. Закрыццё вядучай недзяржаўнай газеты "Народная Воля" ў сённяшняй напружанай сітуацыі з'яўляецца спробай тушыць пажар бензінам. У імя інтарэсаў Беларусі рэдакцыя гатова да канструктыўных перамоў з прадстаўнікамі Адміністрацыі Прэзідэнта РБ і Міністэрства інфармацыі для ўрэгулявання спрэчных пытанняў.

Іосіф Сярэдзіч,
галоўны рэдактар газеты "Народная Воля".

Старшыні Грамадскага каардынацыйнага савета у сферы масавай інфармацыі сп.Якубовічу П.І.

Прашу тэрмінова склікаць Грамадскі каардынацыйны савет у сферы масавай інфармацыі для абмеркавання крытычнай сітуацыі, якая склалася вакол газет "Народная Воля" і "Наша Ніва".

Апошнія недзяржаўныя грамадска-палітычныя газеты ў нашай краіне апынуліся на мяжы закрыцця і сваё слова абавязаны сказаць члены Грамадскага каардынацыйнага савета ў сферы масавай інфармацыі, які быў створаны ўрадам.

Іосіф Сярэдзіч,
галоўны рэдактар газеты "Народная Воля".

АДКРЫТЫ ЛІСТ
да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі

Пасля нашай апошняй сустрэчы з Вамі, Аляксандр Рыгоравіч, прайшло 12 гадоў. Тая сустрэча адбылася на Макаёнка, 9, калі Вы прыязджалі на Белтэлерадыёкампанію, каб сказаць "дзякуй" журналістам, што падтрымалі Вас у прэзідэнцкай выбарчай кампаніі на другі тэрмін. Я не ўваходзіла ў лік тых журналістаў, і мне ў хуткім часе прыйшлося сысці з тэлебачання.

Шмат чаго адбылося за гэтыя гады і ў маім жыцці, і ў Вашым: некалькі разоў я ў думках намагалася звярнуцца да Вас на правах даўняга знаёмства і з тым, каб засцерагчы ад шматлікіх памылак.

І вось цяпер, улічваючы небяспечную сітуацыю ў Беларусі, я ўсё ж звяртаюся. Пакуль выходзіць "Народная Воля", пакуль ёсць дзе выказацца, пакуль яшчэ можна не дапусціць горшага. Спыніцеся, Аляксандр Рыгоравіч! Не бярыце грэх на душу: не ламайце лёсы і жыцці людзей. Упэўнена, Вам гэта цяжка зрабіць, але прымусьце сябе. І Вам адразу стане лягчэй.

Вы добра ведаеце, што спецслужбы падчас выбараў перайгралі саміх сябе, зрабілі і Вас асабіста, і беларусаў закладнікамі перад Захадам і перад Расіяй. І я звяртаюся да Вас ад імя беларускіх жанчын, якім неабыякавы лёс нашай краіны: дайце загад вызваліць усіх зняволеных за падзеі 19 снежня 2010 года. Не падзяляйце беларусаў на сваіх і чужых.

Душа баліць за ўсіх зняволеных, асабліва за тых, у каго засталіся малыя дзеткі. Вы, як бацька малога дзіцяці, добра разумееце, што можа стацца з Вашым маленькім сынам, калі Вас, Аляксандр Рыгоравіч, адарваць ад яго. І як ламаецца псіхіка і характар дзіцяці, калі ён застаецца адзін. Калісьці майму маленькаму сыну адзін журналіст задаў пытанне: "Ці падабаецца табе бачыць сваю маму на экране тэлевізара?" Ён заплакаў і сказаў: "Я не люблю яе работу. Яе ніколі не бывае дома".

На «Дажынках». 1996 год.

Але ж я заўсёды вярталася. Сыходзіла, з'язджала і абавязкова вярталася. А пры сустрэчах у мяне сэрца разрывалася ад шчасця, калі я бачыла радасныя вочкі сына. Мой сын ведаў, што мама вернецца.

А што патлумачыць маленькаму Даньку Саннікаву, Дашцы, Лёшы і Арсенію Класкоўскім? Прашу Вас, вызваліце арыштаваных!

Падумайце, як пачуваюць сябе дзеткі беларускіх зняволеных. Падумайце, як пачуваюць сябе дзеткі журналістаў недзяржаўных газет, чыіх бацькоў вы вырашылі пакінуць без працы толькі за тое, што яны маюць іншыя думкі і іншыя погляды. Спыніце гэты наступ. Не дзяліце дзяцей на "правільных" і "няправільных"!

Аляксандр Рыгоравіч, вы не там пачалі шукаць ворагаў. Ворагі — тыя, хто маўчыць і хлусіць, а людзі з адкрытай пазіцыяй на подласць і здраду не здольныя. Прашу Вас, не душыце апошнія пляцоўкі вольнага слова ў нашай краіне, пакіньце людзям права мець свае меркаванні і свабодна іх выказваць праз любімыя газеты — "Народную Волю" і "Нашу Ніву". Гэта і для Вас асабіста будзе гарантыяй, што не прыйдзецца некалі жыць у краіне і не мець права сказаць у ёй нават слова. Наогул, калі, не дай Бог, здарыцца закрыццё той жа "Народнай Волі", то Вам сумна будзе пачынаць свой працоўны дзень менавіта без гэтай газеты.

Прашу Вас, будзьце добразычлівым, спачувальным і справядлівым, і Вам самому лягчэй стане жыць!

Зінаіда БАНДАРЭНКА,
народная артыстка Беларусі,
12 гадоў таму мастацкі кіраўнік аддзела дыктараў Беларускага тэлебачання.

Тревога Станислава Богданкевича

Станислав Богданкевич, член Общественного консультативного Совета при Администрации Президента Республики Беларусь, почетный председатель Объединенной гражданской партии, профессор, предложил коллегам по Совету и лично его председателю В.В.Макею срочно обсудить ситуацию, сложившуюся с попыткой закрыть две основные негосударственные газеты. Он написал:

"В связи с попыткой Министерства информации под надуманными мелкими предлогами, в нарушение конституционных норм о недопущении цензуры, монополизации СМИ и прав на свободу информации закрыть старейшие негосударственные газеты "Народная Воля" и Наша Ніва" вношу предложение в срочном порядке провести заседание ОКС с приглашением на него министра информации и главных редакторов вышеуказанных газет".

Игорь КОРЗУН.

Майкл СКЭНЛАН:
«Пазіцыю Злучаных Штатаў Амерыкі, якая зводзіцца да закліку неадкладнага вызвалення ўсіх затрыманых, падзяляюць Еўрасаюз і ўрад Расіі»

Пра гэта днямі сказаў журналістам Часовы Паверaны ў справах ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Майкл Скэнлан.

"Пазіцыя ЗША застаецца нязменнай, — кажа дыпламат. — Мы працягваем заклікаць да неадкладнага вызвалення ўсіх людзей, якія былі затрыманы ў сувязі з падзеямі 19 снежня. Мы настойліва заклікаем зняць усе абвінавачанні і вызваліць людзей, якім ужо вынесены прыгаворы.

Калі Беларусь хоча быць часткай Еўропы ў шырокім кантэксце — пра тое і не варта было б гаварыць, — то ў краіне павінны захоўвацца належныя дэмакратычныя працэдуры.

І я хачу падкрэсліць, што пазіцыю Злучаных Штатаў Амерыкі, якая зводзіцца да закліку неадкладнага вызвалення ўсіх затрыманых, падзяляюць таксама Еўрапейскі Саюз і ўрад Расіі".

Суд над Някляевым могуць перанесці

Да паэта, які знаходзіцца пад хатнім арыштам, ужо чатыры дні прыходзіць доктар з КДБ.

Уладзімір Някляеў не здолее вытрымаць цэлы дзень на лаве падсудных падчас судовага пасяджэння па яго справе з-за дрэннага стану здароўя. Як паведаміла "Еўрарадыё" жонка экскандыдата ў прэзідэнты Вольга Някляева, да палітыка ўжо чатыры дні прыходзіць доктар з КДБ.

— У яго радыкуліт развіўся, — гаворыць жонка Някляева. — Паглядзім, што будзе, але ўжо тыдзень ляжыць. І я не ведаю, калі так будзе балець спіна, як ён у судзе выседзіць — гэта ж цэлы дзень там трэба правесці...

Нагадаем, суд над Уладзімірам Някляевым прызначаны на 5 мая. Па словах Вольгі, напярэдадні суда да іх прыйдуць адвакаты і будуць думаць, што рабіць. Магчыма, прасіць аб пераносе судовых слуханняў на іншы дзень.

Калі будуць першыя навальніцы?

Згодна з прагнозам Рэспубліканскага гідраметэацэнтра, на выхадных можна чакаць першых навальніц.

Так, 30 красавіка ў Беларусі будзе воблачна з праясненнямі, месцамі кароткачасовыя дажджы, па паўднёвым захадзе навальніцы. Вецер паўночны 3—8 м/с, пры навальніцах парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ноччу плюс 2—8°С, днём плюс 12—17°С; па поўдні ноччу плюс 9—11°С, днём плюс 18—23°С.

1 мая ў Беларусі воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Вецер паўночна-ўсходні 4—9 м/с, пры навальніцах парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ноччу плюс 2—8°С, днём плюс 10—17°С; па поўдні ноччу плюс 9—11°С, днём плюс 18—22°С.

Андрэй САННІКАЎ:
«Мы хацелі паказаць, што ў Беларусі шмат людзей жадаюць чэсных выбараў»

У адным будынку — Доме правасуддзя — суддзяць адразу дзесяць фігурантаў "справы 19 снежня". Справы экс-кандыдата на пасаду прэзідэнта Андрэя Саннікава, Уладзіміра Яроменкі, Іллі Васілевіча, Алега Гнедчыка і Фёдара Мірзаянава разглядаюць у судзе Партызанскага раёна. У Кастрычніцкім судзе судзяць Паўла Вінаградава (былога фігуранта "справы 14-ці"), Андрэя Пратасеню, Дзмітрыя Дразда, Алеся Кіркевіча і Уладзіміра Хамічэнку. Усім інкрымінуюць удзел у масавых беспарадках, Андрэй Саннікаў абвінавачваецца ў арганізацыі гэтых масавых беспарадкаў, а Павел Вінаградаў адказвае яшчэ і за знявагу дзяржаўных сімвалаў.

Андрэй Саннікаў адразу заявіў, што справа з'яўляецца палітычнай, і заклікаў суд прытрымлівацца прававых норм.

"Чаму я заклікаў прыйсці на плошчу 19 снежня? Таму што гэта нармальная традыцыя — у дзень галасавання збірацца на плошчы. На жаль, у нас гэтая традыцыя сумная, бо ў нас няма справядлівых выбараў. Мэтай мірнай дэманстрацыі было паказаць, што ў Беларусі шмат людзей жадаюць чэсных выбараў. Мэтай было паспрабаваць паўплываць на справядлівы падлік галасоў ЦВК... І са здзіўленнем пачуў у абвінавачанні, што я на плошчы абвяшчаў уладу нелегітымнай. Такіх заяў я не рабіў", — сказаў палітык.

Андрэй Саннікаў падкрэсліў: *"Ні ў мяне, ні ў іншых кандыдатаў не было нават планаў стварэння нейкіх груп. Я не заклікаў да гвалту. Не было нічога такога, пра што потым гаварылася".*

На пытанне адваката "Ці былі гвалтоўныя дзеянні да нейкіх асоб?" Саннікаў адказаў, што была абсалютна мірная акцыя, не было масавых беспарадкаў.

"Супрацоўнікі ДАІ перакрывалі прылеглыя вуліцы, каб не ехалі на праспект, і кіроўцы сігналілі ў знак падтрымкі дэманстрантаў. Ніхто не абураўся. Для гандлёвых прадпрыемстваў ніякіх пагроз не было".

Працэсы, якія пачаліся ў Доме правасуддзя 27 красавіка, далёка не першыя ў справе за Плошчу. Пакаралі ўжо больш за дзясятак чалавек. Дваім пакараным — грамадзянам Расійскай Федэрацыі — "пашчасціла", і яны мусяць толькі заплаціць штраф. Аднаго пакаралі абмежаваннем волі, а іншых зняволілі на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

Але толькі падчас суда над Саннікавым нарэшце стала зразумела гісторыя з ледасекамі, якія пералічваліся ва ўсіх пракурорскіх абвінавачаннях. Высветлілася, што так следчыя, а потым спецназаўцы ў судах называлі скрабкі для чысткі снегу з плітак.

Саннікаў сказаў: *"Называйце рэчы сваімі назвамі. Мы тут у судзе высветлілі, што не было ніякіх ледасекаў. Ледасекам забілі Троцкага, а тут знайшлі некалькі скрабкоў, якімі ачышчаюць лёд. Дык гэта ж іншыя рэчы".* І дадаў: *"Я потым шукаў на плошчы шапку Іры і не бачыў ніякіх прадметаў пасля разгону людзей. У дэманстрантаў нічога такога не было. Калі б была арматура, то гэта было б прыкметна і бачна. Я добра бачыў, што ў каго было. Акрамя сцягоў, нічога".*

Маладыя людзі распавядалі на працэсах пра метады псіхалагічнага ўздзеяння на іх з боку следчых. Студэнт трэцяга курса факультэта эканамічнай кібернетыкі **Фёдар Мірзаянаў** казаў, што кіраўнік следства спадар Казакевіч прапанаваў яму напісаць, што кандыдаты на пасаду прэзідэнта абяцалі яму грошы, калі той пойдзе на акцыю. Калі ж студэнт адмовіўся, яго арыштавалі. Потым Фёдару прапанавалі часткова прызнаць віну і за гэта яго абяцалі адпусціць пад падпіску аб нявыездзе. Ён тады мог бы здаваць сесію. Хлопец пагадзіўся, але яго так і не вызвалілі. Потым Мірзаянава прасілі напісаць, што ён з'яўляецца сябрам хоць якой-небудзь маладзёжнай арганізацыі.

Фёдар казаў, што заклік прыйсці на Плошчу пачуў на БТ ад кандыдата ў прэзідэнты **Яраслава Раманчука**. На плошчы быў разам са сваім сябрам **Іллёй Васілевічам**. Яны бачылі, як да ганка Дома ўрада падбеглі некалькі чалавек. Яны былі ў чорных шапках. Адны білі шкло, другія здымалі гэта на відэа. Ілля і Фёдар сталі разам з іншымі хлопцамі ланцугом, каб не прапусціць на ганак правакатараў. Калі Мірзаянаў пасля разгону ўбачыў вострыя кавалкі шкла, то ён выцягнуў іх і паклаў на шафу, каб не параніліся людзі.

На судах прысутнічалі прадстаўнікі дапламатычнага корпуса, сваякі абвінавачаных, журналісты і далёка не ўсім сябрам ці знаёмым можна было патрапіць у судовыя залы. Зноў была ўжыта праверaная тактыка — загадзя амаль палову месцаў заняць студэнтамі-практыкантамі. Адзінае, што на спрэчкі іх не водзяць, маўляў, мала што яны там крамольнага пачуюць у прамовах адвакатаў і абвінавачаных.

Такая ж сітуацыя была на судзе над **Зміцерам Бандарэнкам** 26 красавіка. Усе, вобразна кажучы, засыналі, калі прадстаўнік абвінавачання зачытваў раздрукоўкі тэлефонных перамоў каардынатара "Хартыі'97". Незразумела, якое дачыненне да "справы 19 снежня" можа мець дыялог на пачатку восені: *"Наташа, прывітанне. Не разбудзіў? Можаш размаўляць? Слухай, можа, перамясціць той банер з левага боку ніжэй і на правы бок. Мне падаецца, што так ён будзе лепш выглядаць і вока так не б'е".* Альбо, напрыклад, абяцанні набыць хлеб па дарозе дадому. Бандарэнка казаў, што нават следчы тлумачыў яму, што "праслушка" была незаконнай. Ён заявіў, што яшчэ ў верасні за штабамі кандыдатаў пільна сачылі і дзеля гэтага рабілі незаконныя праслухоўванні тэлефонаў кожнага. Ведаў бы ён тады, што звычайныя званкі сябрам кшталту: *"Што робіш? Давай сустрэнемся, вып'ем кавы?"* будуць каштаваць яму зняволення на два гады...

Любоў ЛУНЁВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 КРАСАВІКА—5 МАЯ 2011 г.

ПАСЛЯ ТРАГЕДЫІ

«Маці адчувала, што ў Віталіка ўжо няма ног...»

Мой тэлефонны званок заспеў Алену, старэйшую сястру загінуўшага ад выбуху на станцыі метро "Кастрычніцкая" Віталя Дайнекі, на Паўночных могілках Мінска. Яна прыехала на магілу брата на наступны дзень пасля яго пахавання... Віталю Дайнеку было толькі 40 гадоў...

Віталь Дайнека з дачкой Алінай. 2006 год.

Мы дамовіліся з Аленай Віктараўнай аб сустрэчы...

Пра брата яна гаворыць у цяперашнім часе і толькі праз паўзу папраўляецца і фармулюе думкі і ўспаміны пра Віталя ў мінулым часе. Жанчына стараецца трымацца, але ўсё ж раз-пораз зрываецца на слёзы. Ёй не верыцца, што Віталь ужо толькі "быў"...

"У той злашчасны дзень, 11 красавіка, Віталь ехаў з працы", — распавядае Алена Віктараўна. — Апошні дзясятак гадоў свайго жыцця ён працаваў на будаўніцтве. Брат быў страхаром. Іх брыгада працавала на ўзвядзенні чарговага аб'екта. Пасля работы Віталя разам з калегамі падвезлі да метро "Каменная горка". З тым, каб трапіць дамоў (жыў ён на Чкалава), Віталю трэба было зрабіць перасадку з адной лініі метро на другую. Разам з калегамі па працы яны былі на "Кастрычніцкай" якраз у момант выбуху. Сябры брата сталі за калонай, гэта іх уратавала, а Віталь апынуўся ў самым эпіцэнтры выбуху..."

Пра тое, што з Віталем здарылася нешта жудаснае, першай адчула ягоная маці. Менавіта 72-гадовая Рыма Аляксандраўна цяжэй за іншых блізкіх перажывае трагедыю Віталя Дайнекі: " Я не магу ўявіць, што зараз творыцца ў ейным сэрцы", — гаворыць Алена Віктараўна. — Мама ўсё жыццё на Віталіка нарадавацца не магла. Віталь рос спакойным хлопчыкам, турбот бацькам не надаваў, у школе вучыўся добра, цікавіўся спортам, займаўся фехтаваннем.... І ён з самага дзяцінства адказваў маці ласкай, адчуваў, што яна яго бязмерна любіць... І ведаеце, калі гавораць пра нябачную духоўную повязь паміж блізкімі людзьмі, то яскравы прыклад — гэта наша мама і Віталь... Яна і адчула, што з ім бяда..."

Адразу пасля таго, як стала вядома пра выбух у метро, сваякі па просьбе Рымы Аляксандраўны набралі 103, там ужо былі першыя спісы пацярпелых. Так і высветлілася, што Віталь Дайнека знаходзіцца ў Бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі... "Ён быў самым "цяжкім" сярод пацярпелых ад выбуху", — скрозь слёзы гаворыць сястра Віталя Дайнекі. — Пасля выбуху яму моцна пашкодзіла ногі, была пашкоджана барабанная перапонка, на целе былі моцныя апёкі. Урачы нас супакойвалі, як маглі, казалі, усё абыдзецца, усё робіцца... І толькі маці месца сабе не знаходзіла і ўвесь час пыталася: "Што ў яго з нагамі?" Гаварыла, што ёй у ногі ўвесь гэты час моцна пячэ. А мы ўсе маўчалі, што Віталю ампуціравалі ногі... Але яна адчувала, што ў яго няма ног... Усе гэтыя два тыдні, што ўрачы змагаліся за жыццё брата, ён правёў у непрытомнасці. Зразумела, нас да яго не пускалі, казалі толькі што робіцца ўсё магчымае для яго... Ведаю толькі, што Віталю рабілі шматгадзінныя аперацыі. Але... Так ён у прытомнасць і не прыйшоў... Хавалі яго ў закрытай труне..."

Алена Віктараўна ўспамінае пра сваю апошнюю сустрэчу з братам: "Ведаеце, зараз такое адчуванне, як жа шмат паміж намі недагаворанага, як жа шмат мы не паспелі", — гаворыць яна. — Апошні раз я бачыла брата жывым напрыканцы сакавіка, ён прыходзіў да мяне ў бальніцу, я якраз перанесла аперацыю. Ён прыйшоў, перадачу прынёс, пагаварылі... У мяне пасля аперацыі сляды засталіся, помню, ён тады казаў: "Лена, не паказвай мне іх, не трэба..." Пасядзелі, ён пайшоў, як высветлілася, пайшоў назаўжды...

Ведаць бы тады, што гэта наша апошняя сустрэча была... А зараз пра яго ўспаміны карцінкамі выплываюць... Вось ён зусім маленькі, я яго на ровары вучу катацца... Вось мы падлеткамі разам з ім у бабулі на канікулах грыбы-ягады ў лесе збіраем... Вось мама яго "Розікам", а не Віталікам называе... Гэта быў такі ласкавы мамін зварот да яго...

Вось ён ужо сталы, пасля арміі, дапамагае мне з дзецьмі маімі сядзець. Ён заўжды прыходзіў і казаў: "Лена, ты можаш пайсці ў кіно, а я за дзецьмі прыглядзі... Ён увогуле дзяцей любіў. Калі ў яго свая дачка нарадзілася, ён быў на сёмым небе ад шчасця... І вось які лёс: мы пахавалі Віталя 26 красавіка, а на наступны дзень яго дачцэ Аліне 17 гадоў споўнілася.... Яна якраз школу заканчвае... І таксама не верыць, што ніколі больш не абдыме бацьку...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

НАРОДНАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ

Чарнобыльцам ад Пола Мура і ўсяе Амерыкі...

Спецыяльным авіярэйсам дастаўлены гуманітарны груз (медыкаменты для анкалагічна хворых дзяцей з Беларусі) са Злучаных Штатаў Амерыкі. Гэты рэйс, пачынаючы з 1991 года, — 974-ы па ліку...

У 25-ю гадавіну Чарнобыльскай катастрофы амерыканцы — дзякуючы неймаверным высілкам пачынальнікаў гуманітарнай місіі Пола Мура і ягонага сына Пола Мура-малодшага і пры ўзаемадзеянні з беларускай дабрачыннай арганізацыяй "Надзея-Экспрэс" — прывезлі найбольш дэфіцытныя ў нашай краіне медыцынскія прэпараты, на агульную суму ў 6 млн 200 тыс. долараў. Анкалагічныя лекі, так неабходныя хворым дзецям, будуць размеркаваны па шпіталях, накіраваны ў Цэнтральны дзіцячы анкацэнтр.



Што змушае Пола Мура і ягоных паплечнікаў — ахвяраваць уласнымі фінансамі і немалымі высілкамі дзеля ўсіх нас, нашых дзяцей? У ЗША шмат дабрачынных арганізацый, якія дапамагаюць хворым, бедным, абяздоленым людзям па ўсім свеце. А змушае простых амерыканцаў дзяліцца з людзьмі, якіх яны нават не ведаюць, звычайная людская сардэчнасць. Жаданне дапамагчы бліжняму не дзеля самасцвярджэння, а проста так.

Бацька і сын Муры прыехалі на Беларусь у пачатку 90-х. Не маглі не прыехаць, бо з медыяў ведалі пра Чарнобыль, пра гора і пакуты пацярпелых, пра наступствы атамнай катастрофы. У простых заплечніках прывезлі лекі для дзяцей. У шпіталі для анкахворых усё на свае вочы і пабачылі. І ўбачанае, перажытае настолькі ўзрушыла абодвух, што свет здаўся чорным. Але была і светлая паласа падчас тае вандроўкі — яны адкрылі для сябе Беларусь, краіну, практычна няведаную ім раней. Усё выклікала захапленне — народнае мастацтва, музыка, спевы, мова, гісторыя нашай зямлі. Але найбольш — самі людзі, асабліва дзеці... Полу-малодшаму было тады 17 гадоў. І трэба ж было здарыцца — ён сустрэў тут сваё першае каханне. Вось толькі бяда кружыла над іхнім кароткім шчасцейкам: дзяўчына хварэла на анкалогію... Чарнобыль адмераў ёй кароткае жыццё. Паміраючы, яна прасіла Пола, каб ён абавязкова быў шчаслівы і каб дапамагаў хворым беларускім дзецям — наколькі зможа, наколькі стане моцы. Пол Мур даў слова сваёй каханай — слова хрысціяніна, слова джэнтльмена... І стрымаў яго.

З гадамі сардэчная рана ў Пола зарубцавалася і ён выканаў просьбу сваёй першай каханай — стаў шчаслівым бацькам чацвярых дзяцей. У прыгожага, статнага мужчыны Пола Мура цудоўная сям'я, жонка, дом. І ён шчаслівы — што ўсё гэта ёсць, што жыццё напоўнена да краёў. А яшчэ, што частку свайго сэрца, самога сябе аддае дзецям, за якіх прасіла тая, што падарыла яму — насуперак чорнаму Чарнобылю — невыказна светлае пачуццё любові... І так будзе доўжыцца вечна, бо датуль існавацьме жыццё, дакуль будзе каханне, любоў, павага, супражыванне, ахвярнасць. Жанчына, краіна, чалавек з суседняга двара, незнаёмы хлапчук альбо дзяўчынка з іншага канцінента — усё гэта мы, людзі аднае крыві, аднаго паходжання. Пакуль, можа, і не так у свеце, але ж павінна быць, як у Пола. А інакш усё губляе сэнс...

Георгій ЧЫГІР.
Фота аўтара.

Инфляция уже превысила годовой прогноз

В Беларуси инфляция с 1 по 19 апреля составила 2,5%, сообщается в пресс-релизе Белстата. В I квартале потребительские цены выросли на 6,1%.

Таким образом, за прошедшие с начала года 3 месяца и 20 дней инфляция в Беларуси составила 8,75% при утвержденном целевом прогнозе на год в пределах 7,5—8,5%, передает "Интерфакс Запад".

По данным Белстата, в апреле наибольший прирост цен отмечен на масло растительное (15,3%), овощи (10,6%), фрукты (9,5%), чай (8,9%), легковые автомобили (9,8%).

Как сообщалось, в связи с острой нехваткой валюты в Беларуси в апреле происходит резкий рост цен на импортное продовольствие.

В соответствии с прогнозом социально-экономического развития на текущий год правительство прогнозирует снижение инфляции до 7,5—8,5% с 9,9% в 2010 году и 10,1% в 2009 году.

Международный валютный фонд ожидал снижения инфляции в Беларуси в 2010 году до 7,3% и прогнозирует ее рост до 12,9% в 2011 году. В следующем году МВФ ожидает замедления инфляции до 9,7%. Ранее МВФ оценивал инфляцию в Беларуси в 2011 году на уровне 10,5%.

Пакараныя за нелюбоў да беларускага

Службовыя асобы гомельскага гандлёвага прадпрыемства "Цэнтр" пакараныя за тое, што прадукцыя айчынных вытворцаў была прадстаўлена ў іх у вузкім асартыменце.

Як вынікае з паведамлення Камітэта дзяржкантролю па Гомельскай вобласці, гэтым прадпрыемствам *"у выніку значнага аб'ёму імпартнай прадукцыі не асвоены размеркаваныя гарвыканкамам аб'ёмы кандытарскіх вырабаў айчынных вытворцаў, іх прадукцыя ў шэрагу магазінаў прадстаўлена ў вельмі вузкім асартыменце".*

Напрыклад, адзначае КДК, з 25 дагавораў, заключаных гэтым гандлёвым прадпрыемствам на набыццё кандытарскіх вырабаў, 17 было заключана з камерцыйнымі арганізацыямі — імпарцёрамі кандытарскіх вырабаў. КДК таксама ўстанавіў факты недакладных звестак аб паходжанні тавараў: у інфармацыйных картках на некаторыя імпартныя тавары ў якасці айчынных вытворцаў указваліся прадпрыемствы-імпарцёры.

Па выніках праверкі да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 22 службовыя асобы ААТ "Цэнтр", да дысцыплінарнай — 45. Але застаецца пытанне: калі Беларусь такая ўжо рынкавая краіна, дык на якой падставе дзяржава ўмешваецца ў пералік таго, што можна прадаваць у магазінах?

ДЗВЕ ПАЗІЦЫІ

У "Народнай Волі" за 8—11 красавіка быў надрукаваны артыкул "Ветэран Дзідэнка: маладосць — у акопах, старасць — у гнілой хаце". Надрукаваны, заўважым, пад рубрыкай "Лёс чалавека", што сведчыць пра намер аўтара расказаць чытачам не толькі пра сённяшняе жыццё ветэрана, але і наогул пра яго шляхі-дарогі, пра тыя цяжкія выпрабаванні, якія выпалі на яго долю і якія ён вытрымаў з гонарам.

Здавалася б, ніякай тэндэнцыйнасцю аўтар публікацыі не кіраваўся, паказаў жыццё чалавека так, як яно ёсць. Але...

У прэс-сакратара старшыні Мінскага аблвыканкама Галіны Трафіменка сваё бачанне сітуацыі. І яна выклала ўсё на паперы. Як і абяцалі, друкуем без скарачэнняў і без правак.

У той жа час мы не маглі не паказаць ліст Г.Трафіменка спадару Уладзіміру Марозу, аўтару артыкула, які выклікаў рэзананс. І, вядома ж, не адмовілі яму ў праве яшчэ раз выказацца.

Рэдакцыя газеты "Народная Воля".

Што хацеў напісаць, тое і напісаў...

Мікалай Акімавіч Дзідэнка, убачыўшы нас у сваёй хаце, расхваляваўся, а ў вачах заблішчалі слёзы. Сацыяльны работнік Надзея Белацарковец, якая займалася наведзеннем парадку ў хаце, хуценька падала яму сардэчных кропляў.

— Это вы из-за той газеты из Минска приехали? С Копыля от председателя райисполкома уже приезжали, я им сказал, что я ничего такого не говорил, всё это неправда, что написано, — Николай Акимович не может никак успокоиться. — Знал бы, что он такое напишет, выгнал бы из дома... Мне стыдно перед людьми.

Нагадаю, што аўтар пачынае свой расказ з таго, як павесялеў інвалід вайны, калі да яго прыйшоў гэты самы журналіст, бо **"звычайныя людзі, не кажучы пра розных начальнікаў, так рэдка наведваюцца"** (выдзелены тэкст тут і далей — гэта цытаты з матэрыяла У.Мароза. — заўвага аўтара). Супрацоўнікі мясцовага ААТ "Капыльскае", аўтамабільнага парка №21, дзе працаваў доўгі час Мікалай Дзідэнка, сацыяльныя работнікі, спецыялісты Цімкавіцкага сельскага Савета, вучні мясцовай школы, суседзі, дзеці і ўнукі ветэрана — гэта далёка не поўны пералік тых, хто часцяком бывае ў хаце ветэрана, і не проста прыходзяць з візітам, а аказваюць яму канкрэтную дапамогу.

"Перабіваецца разам з дачкой (жонка памерла колькі год таму) у струхлелай хатцы, якая старэй за самога гаспадара, а пайшоў жа Мікалаю Акімавічу 87-ы год..." На мой погляд, спадар Мароз, мабыць, так спяшаўся паведаць усяму свету аб невыносных умовах жыцця заслужанага чалавека, у тым ліку і пра ўзрост "струхлелай хаткі", што праз колькі радкоў пачаў ужо распавядаць аб тым, як цяжка было будаваць гэту хату яе гаспадару, калі ён вярнуўся з вайны! Але ж калі мяне не падводзіць памяць, вайна скончылася ў 1945 годзе, дык як можа быць гэтай хаціне больш гадоў, чым яе 86-гадоваму гаспадару? Старшыня таварыства "Капыльскае" Анатоль Кіула абураны напісаным, бо ўсе просьбы Мікалая Акімавіча наконт рамонтных работ, спіліць старыя яблыні ў садзе ці зрабіць новы плот выконваюцца пры першай жа магчымасці.

"Бывае, заходзіць сацыяльны работнік, дапамагае". Не буду пераказваць змест справаздачы аб аказаных паслугах і дапамозе інваліду Вялікай Айчыннай вайны М.А.Дзідэнку за 2010 год і бягучы перыяд гэтага года — афіцыйнага дакумента, які па маёй просьбе мне далі ў райвыканкаме (пры неабходнасці магу пераслаць у рэдакцыю), скажу толькі вось што. З 2005 года ветэран знаходзіцца на надомным абслугоўванні, сацыяльны работнік тры разы на тыдзень аказвае яму ўвесь комплекс сацыяльных паслуг, у тым ліку і па апрацоўцы прысядзібнага ўчастка. Аплата складае ўсяго 12 920 рублёў у месяц (40% ад поўнага кошту). Сярэднямесячная пенсія Мікалая Акімавіча складае 1 мільён 30 тысяч рублёў.

Штогод па сабекошце на падворак да ветэрана прывозяць бульбу і іншую, заказаную ім, гародніну. Каля хаты сацыяльны работнік Надзея Сцяпанаўна садзіць і даглядае агарод. Год таму адрамантавалі старому падлогу на кухні і печ, замянілі два акны, зрабілі новы драўляны плот, за кошт тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання поўнасцю замянілі старую электрапроводку ў хаце. Гэтым летам сацыяльныя работнікі паабяцалі ветэрану паклеіць новыя шпалеры ў хаце і пафарбаваць вокны. Дачка Мікалая Акімавіча Святлана, якая таксама жыве ў бацькоўскай хаце, расказала, што больш як паўтара года таму адрамантавалі дах, за што вельмі ўдзячны старшыні мясцовай гаспадаркі Анатолю Кіула. Між тым у матэрыяле У.Мароза чытаем: **"дах скрозь дзіравы... у сенцах трэба столь падшыць, бо моцна цячэ".** Тут, як кажуць, без каментарыяў: што хацеў напісаць, тое і напісаў.

Наша размова з Мікалаем Акімавічам і яго дачкой доўжылася каля дзвюх гадзін. Ветэран з гордасцю паказвае свае баявыя ўзнагароды, святочныя паштоўкі, фатаграфію, зробленую ў мінулым годзе падчас паездкі на мемарыяльны комплекс "Лінія Сталіна". Паездку для былога работніка М.Дзідэнкі арганізаваў бясплатна дырэктар ДУП "Аўтапарк №21" Уладзімір Сахар, які, дарэчы, некалькі гадоў таму ўзяў шэфства над пенсіянерам і шмат дапамагае яго сям'і.

У мінулым годзе, акурат напярэдадні святкавання 65-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, рашэннем праўлення таварыства яму быў выдзелены новы добраўпарадкаваны катэдж у аграгарадку Цімкавічы, але ветэран адмовіўся (ёсць яго пісьмовы адказ), бо хоча дажываць век у роднай хаце. Тым больш, як сцвярждае М.Дзідэнка, усе яго просьбы да мясцовай улады выконваюцца, не забываюць яго ні ў будні, ні ў святочныя дні.

"Лаўлю сябе на думцы, што ў гэтага чалавека адзінае багацце — памяць пра сям'ю, вайну ды пра гаротнае сваё жыццё" — так завяршаецца матэрыял Уладзіміра Мароза пра "гаротнае" жыццё ветэрана.

Я ж хачу завяршыць сваю справаздачу аб камандзіроўцы ў Капыль пытаннем да аўтара гэтага матэрыяла. Уладзімір, няўжо вам не сорамна за той бруд і хлусню, якія вы вынеслі на старонкі газеты, — перад чытачамі, перад калегамі-журналістамі, перад вашымі землякамі, хто дапамагае Мікалаю Дзідэнку па доўгу службы і па наказу сэрца дастойна дажыць наканаваны лёсам век? І самае галоўнае: ці знойдзеце вы ў сябе хоць кроплю мужнасці і сумлення папрасіць прабачэння ў чалавека**, на маю думку,** багацце якога заключаецца ў тым, што ў яго сэрцы жыве сапраўдная і адказная любоў — да роднай Айчыны, да людзей, да сям'і, да жыцця. І, прабачце, калега, мяркуючы па ўсім, якраз гэтага вам нестае. Як і адказнасці за сваё журналісцкае слова.

Галіна ТРАФІМЕНКА,
прэс-сакратар старшыні Мінскага аблвыканкама.

Ветэран ДЗІДЭНКА:

«Дах залаталі, столь падшылі, бярвёны зашалявалі...»

Напярэдадні Вялікадня, нічога не ведаўшы пра ліст у рэдакцыю спадарыні Трафіменка, наведаў Цімкавічы, каб разам з аднавяскоўцамі пабываць на мясцовых могілках, пакланіцца памерлым блізкім, родзічам.

У суботу ранкам завітаў да Мікалая Акімавіча ды яго дачкі Святланы. Прывёз новую фотакартку. З маленькай франтавой, састарэлай хутчэй за гаспадара, майстры зрабілі сучасную. Прымаладзілі сямейную рэліквію.

— Дзякуй вам. Мне прывезлі газету. З дачкою ўважліва прачыталі. Я вам удзячны. Пабывалі ў нас кіраўнікі з Капыля. З Мінска сакратарка губернатара была. Ветлівая. Усё агледзела. Сказала: "Вам все делается, как ветерану войны". Пасля яе візіту дзеткі-школьнікі пафарбавалі плот, камяні фундаменту. Дзякуй ім, дай Гасподзь усім здароўя! Затым заявіліся цесляры. Добра падшылі столь. Учора прыняліся за тылавую сцяну хаты: абабіваюць дошкамі, якія захаваліся ў мяне на гарышчы. Ці хопіць тых дошак? Вы прыйшлі рана. Сёння цесляры будуць пазней. Можа, захочаце што ў іх запытаць, — паведаў гаспадар.

— Вельмі добра, калі ўзяліся за рамонтныя работы, — кажу я.

— Моцна крануў мяне званок з Барысава. Чалавек назваўся Мікалаем Іванавічам. Казаў, выразаў з газеты вашу друкоўку ды разам са сваім допісам адправіў старшыні райвыканкама Анатолю Іосіфавічу Жданеню. Казаў, з'яўляецца старшынёй ветэранскай арганізацыі. Абяцаў мне, што будзе тэлефанаваць.

На двары — цяплынь. Прыгажосць. Вясна! Да гамонкі далучаецца дачка Мікалая Акімавіча:

— Зараз усе заварушыліся. Зачапіла публікацыя мясцовую ўладу. Калі былі з Капыля, а з імі старшыня сельсавета Алена Вострыкава, я нагадала ім пра адносіны да чалавека. Бацьку споўнілася 85 год. Ніхто не павіншаваў! Пазваніла: "Як вам не сорамна? Чалавека забылі ў такі дзень!". Зараз яна (маецца на ўвазе А.Вострыкава. — **Аўт.**) кажа: "Я давала заметку ў раённую газету". Пытаюся: "Калі? Як добра, прабачце, адбрыла..." Тады старшыня сельсавета кажа: "Зачем пожаловались в газету?" Я ёй: "Чалавек прыехаў пісаць пра ўдзел бацькі ў мінулай вайне. У яго ёсць вочы. Убачыў. Бацька, раскажыце, чаму вас не было на святкаванні 65-годдзя Перамогі ў Капылі?".

— Сапраўды, раскажыце, — пацікавіўся я.

— Пачуў пра падрыхтоўку шэсця ветэранаў у райцэнтры. Да яго 12 кіламетраў, далекавата. Пазваніў Вострыкавай. Папрасіў дапамогу. Яна мне адказала. Вельмі крыўдна было тады і зараз. Я ж Беларусь усю вызваляў...

Да падворка пад'ехалі два цесляры. Мы развіталіся. Дамовіліся сустрэцца ў майскія святочныя дні.

І вось як толькі дабраўся ў Мінск, патэлефанавалі з рэдакцыі "Народнай Волі", сказалі, што на маю публікацыю ёсць пасланне ад прэс-сакратара старшыні Мінскага аблвыканкама Галіны Трафімовіч. Далі прачытаць.

Галіна, я вельмі люблю Цімкавічы, цімкаўцаў з ранняга дзяцінства. Аб франтавіку Дзідэнку ўпершыню пачуў, калі вучыўся ў пачатковым класе мясцовай сярэдняй школы імя Кузьмы Чорнага. Лёсам наканавана было асабіста пазнаёміцца толькі ў сталым узросце. Калі вы знаходзіліся ў пакоі ветэрана, там жа ляжаў стос маіх матэрыялаў, надрукаваных у розных газетах у розныя гады. Для чаго пакінуў іх? Каб праз іх лягчэй знайсці паразуменне еднасці лёсу людзей, апаленых вайною. Апаленых не толькі ў акопах. Падчас другой сустрэчы адчуў: ёсць паразуменне.

Я, Галіна, не ваш "калега". Мабыць, ім ніколі не стану. Сумленне не дазволіць. Хто ў каго будзе прасіць прабачэння? Пакажа час.

Пра маё разуменне, як у краіне ставяцца да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны? З самага верху, лічу, — выдатнае. Нагадаю пра тое, што запала ў душу ад кіраўніцтва краіны. Даручалася на месцах дайсці да кожнага чалавека. Вырашыць пытанні па жыллі. У горадзе — кватэру, на сяле, калі чалавек "прырос" да зямлі, да сваёй хаты, зрабіць усё так, каб жылося ветэрану ў будынку камфортна. Прапаноўвалася не забываць і пасля ўсеагульнай кампаніі па ветэранаў. Можа, гэта выпадкова атрымалася ў Цімкавічах?

Шаноўная апанентка! Калі Вы ўважліва чыталі мой артыкул, то павінны былі заўважыць: я ж не віню ўсю ўладу раёна ў абыякавасці да ветэрана, многа добрага робіцца. Але ж такія людзі, як герой майго матэрыяла, заслугоўваюць большага. Мяне шчыра радуюць дзеянні, якія разгарнуліся ў апошнія дні, у тым ліку з боку самай ніжэйшай улады.

А што тычыцца састарэлай хаты, то, спадарыня Галіна, тут не да месца чыста арыфметычны падыход. Хаты і рэчы, як тая франтавая фотакартка, старэюць хутчэй, чым чалавек.

Я не карэспандэнт "Народнай Волі", але вельмі ўдзячны рэдакцыі за публікацыю двух матэрыялаў з Цімкавіч. З адным вы пазнаёміліся. Варта прачытаць і другі: "Зачапіліся за плот", надрукаваны ў газеце 12—14 кастрычніка 2010 года.

Ён мог з'явіцца і ў абласной газеце. Менавіта туды спачатку аднёс крыўду сямейнай пары перасяленцаў-чарнобыльцаў, якім на дваіх споўнілася 158 год. Але ён праляжаў у рэдакцыі пэўны час без руху. Аднойчы мяне запрасілі і прапанавалі крыўду выправіць, а замест яе пашырыць расповед пра мінулае жыццё на акупіраванай немцамі тэрыторыі, і пра тое, як перанеслі здарэнне на Чарнобыльскай АЭС. Я звярнуўся ў "Народную Волю". Надрукавалі "Зачапіліся за плот". Адразу ў мяне пытанне: "Чаму ж не звярнулі ўвагу на матэрыял? Таксама на стан працы сельсавета? Упэўнены, не давялося б чытаць сённяшняе.

Вамі і мною адзначаны кіраўнік мясцовай гаспадаркі, які добрасумленна аднёсся да ветэрана. А дзе старшыня сельскага Савета Алена Мечыславаўна Вострыкава? Чаму вы, спадарыня Трафіменка, пра яе забылі? Можа, наўмысна?

Калі не дастаткова сказана пра плённую працу кіраўніка, Анатоля Кіулы, калі ласка. Ёсць "Мінская праўда". Згодзен падрыхтаваць матэрыял з усебаковым аналізам працы калектыву, які ён узначальвае.

Да вашага меркавання: "Што хацеў напісаць, напісаў". Так, што хацеў напісаць, напісаў. Інакш нельга. Навошта тады займацца такой справай? Я жадаў расказаць пра мясцовую легенду — Мікалая Адамавіча Дзідэнку. Удзячны лёсу за такі падарунак. Магчыма, дазволяць абставіны занатаваць яго ўспаміны глыбей для творчай працы. Мы і так нядбайна згубілі вялікае багацце: успаміны такіх людзей, як мой зямляк.

І апошняе, спадарыня Галіна Трафіменка, і ў маім ранейшым артыкуле, і тыя словы ветэрана і яго дачкі, якія я прывожу сёння, — усё на бумагу перанесена з ленты памяці. З дыктафона. Адказнасць за журналісцкае слова маю заўжды. Я люблю друкаванае слова. Прысвяціў яму больш за 40 год. Ніколі не забываю, што яно можа параніць чалавека мацней за іншую зброю.

Уладзімір МАРОЗ.

Што сказаць на заканчэнне? Добрую справу зрабіла «Народная Воля», прыцягнуўшы ўвагу да такога заслужанага чалавека, як Мікалай Акімавіч Дзідэнка. Візіт да яго службовай асобы з аблвыканкама пайшоў толькі на карысць ветэрану. І няма сэнсу каментаваць той ці іншы пасаж дыскутантаў.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 КРАСАВІКА—5 МАЯ 2011 г.

ФІНАНСЫ

Беларусь пяройдзе на расійскі рубель?

Амбасадар Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў назваў актуальнай магчымасць перамоў аб уводзе расійскага рубля ў якасці плацежнага сродку ў Беларусі.

"Сітуацыя, шчыра кажучы, актуалізавалася. Напэўна, мае сэнс яе пачаць абмяркоўваць", — сказаў Сурыкаў, распавядаючы пра магчымасць пераходу на расійскі рубель ва ўмовах дэвальвацыі беларускага рубля, якая фактычна ўжо адбылася. — *Актуальнасць гэтага пытання відавочная і для Расіі, і для Беларусі".*

Між тым, паводле слоў амбасадара, умовы прадастаўлення Беларусі расійскіх стабкрэдытаў на 3 млрд долараў не ўтрымліваюць непасрэднага патрабавання аб дэвальвацыі беларускага рубля, перадае *Newsru*.

Беларускі эканаміст, кіраўнік Асацыяцыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва **Сяргей Балыкін** таксама заявіў, што сітуацыю на валютным рынку Беларусі можа выправіць увод у абарачэнне на тэрыторыі краіны расійскага рубля.

ТЫМ ЧАСАМ

Нацбанк Беларусі пакуль адмаўляецца ад расійскага рубля

Нягледзячы на праблемы з валютай, ён не гатовы да ўводу расійскага рубля ў якасці плацежнага сродку на тэрыторыі Беларусі.

Пра гэта паведаміў ІА REGNUM прэс-сакратар Нацбанка Анатоль Драздоў.

Чыноўнік нагадаў, што раней кіраўнік Нацбанка Пётр Пракаповіч ужо заяўляў пра немэтазгоднасць уводу расійскага рубля ў якасці плацежнага сродку на тэрыторыі Беларусі. *"Пазіцыя Нацыянальнага банка па гэтым пытанні пакуль застаецца ранейшай"*, — пацвердзіў Драздоў.

«Белавія» дэвальвіравала рубель на 30%

Нацыянальная авіякампанія Беларусі "Белавія" ўзняла кошты на квіткі ў беларускіх рублях на 30%.

Напрыклад, адзін дарослы білет на самалёт з Мінска ў Кіеў на 27 красавіка каштуе 90 еўра або 523,8 тысячы рублёў, указана на сайце "Белавія".

Такім чынам, няцяжка падлічыць, што курс еўра ў кампаніі складае 5820 рублёў, тады як курс Нацбанка застаецца на ўзроўні 4443 рублі.

МТС не выключае магчымасці павышэння тарыфаў на сотавую сувязь

Павышэнне тарыфаў на сотавую сувязь у Беларусі не выключана. Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар СТАА "МТС" **Уладзімір КАРПОВІЧ.**

Паводле яго слоў, у кампаніі падпісана пагадненне з Міністэрствам эканомікі, якое зацвярджае парадак цэнаўтварэння на паслугі сотавай сувязі. *"Гэты дакумент дае магчымасць беларускаму аператару змяняць тарыфы, аднак пакуль аператар не звяртаўся і не праводзіў перамовы па гэтым пытанні з прадстаўнікамі Мінэканомікі"*, — распавёў Уладзімір Карповіч.

Літва можа абмежаваць імпарт з Беларусі

...каб прымусіць Мінск адмовіцца ад будаўніцтва Астравецкай АЭС. Пра гэта заявіў літоўскі міністр энергетыкі Арвідас Секмокас.

Міністр энергетыкі Літвы Арвідас Секмокас лічыць, што праз сродкі замежнай палітыкі і абмежаванні імпарту Вільнюс можа змяніць рашэнне Мінска будаваць Астравецкую АЭС, паведамляе "Еўрарадыё" са спасылкай на літоўскі партал lrytas.lt

"Нашы дзеянні могуць быць у дзвюх сферах. Галоўная — сродкі замежнай палітыкі як на ўрадавым узроўні, як на ўзроўні МЗС, так і шматбаковым — Міжпарламенцкая асамблея Балтыйскіх краін, Еўрапарламент. Іншая рэч, якую дапускаюць дырэктывы ЕС, — абмежаванне імпарту, які пагражае дэмпінгам нашым энергетычным праектам. Мы абараняемся не ад энергетычных праектаў іншых краін, але ад уздзеяння на нашы энергетычныя праекты", — адзначыў Арвідас Секмокас.

І дадаў, што планаваныя атамныя станцыі ў Астраўцы і Калінінградзе канфліктуюць з літоўскімі энергетычнымі праектамі.

АКТУАЛЬНОЕ ИНТЕРВЬЮ

Алексей ОКЕАНОВ, профессор:

«Эффект Чернобыля мы только начинаем наблюдать»

До сих пор медики, экологи и международные организации ведут спор о последствиях чернобыльской трагедии. Бывший директор Института радиационной медицины, заведующий кафедрой радиационной гигиены и эпидемиологии Международного экологического университета имени Сахарова, профессор Алексей Океанов уверен, что через 25 лет после трагедии рано подводить итоги, сейчас только можно начинать говорить о том, как сказались последствия чернобыльской аварии на здоровье людей.

Правда ли, что белорусские ученые связывают с Чернобылем рост многих заболеваний, и не только онкологических? Подвержены ли облучению белорусы и сегодня? Как спасаться от радиации?

Наш собеседник — профессор ***Алексей ОКЕАНОВ.***

— Алексей Евгеньевич, доводится часто слышать мнение ученых, что белорусы и сегодня подвержены облучению. Но ведь в стране, если верить официозу, установлен жесткий контроль за продуктами питания, уровнем радиации в загрязненных зонах...

— Что случилось в Японии после бомбардировки Хиросимы и Нагасаки? Воздействие радиации на организм человека было однократное, на протяжении нескольких секунд. Чернобыльская трагедия — это облучение пролонгированное, оно в небольших дозах постоянно воздействует на организм человека. И облучение происходит не только внешнее, но, что самое печальное, — внутреннее. Радиоактивные элементы мы вдыхаем с пылью и получаем с продуктами питания.

Все знают, что случилось после аварии: в атмосферу попали продукты деления ядерного топлива — цезий, йод, стронций и другие. Радионуклиды осели на почву. Ученые ожидали, что со временем радионуклиды с водой проникнут в достаточно глубокие слои почвы и проблема таким образом будет решена. К сожалению, этого не произошло. В 1990-е годы радионуклиды находились в основном в поверхностном слое почвы, на глубине 5—10 сантиметров. Спустя 20—25 лет после аварии они опустились вглубь всего лишь на 20—30 сантиметров, и сегодня это заглубление составляет максимум 30—35 сантиметров. Тем не менее на этих территориях ведутся сельскохозяйственные работы. А значит, все эти радионуклиды снова поднимаются наверх и с пылью разносятся в окружающую среду. Это, на мой взгляд, сегодня один из основных факторов риска, особенно среди сельского населения.

Следующий фактор риска — это потребление радионуклидов с продуктами питания. Нужно отметить, что в нашей стране действительно установлен очень жесткий санитарный контроль за продуктами питания. В магазины поступает только "чистая" продукция. В том числе и в Гомельской области, и в Могилевской. Но на загрязненных территориях продолжают жить люди, а в лесах растут грибы, ягоды, водятся дикие животные. Местное население употребляет в пищу овощи со своего огорода, грибы, ягоды и даже дичь из близлежащего леса, где уровень радиации высокий. К счастью, это не массовое явление. Но об этих случаях забывать не надо. Особенно в грибной сезон, ягодный. Карты радиационного загрязнения есть во всех центрах гигиены, и, прежде чем отправиться за дарами природы, следует на них посмотреть. Карты эти не меняются часто, потому что полураспад изотопов идет медленно. До сих пор есть очень высокие зоны загрязнения, например, в Минской области — под Воложином есть такой поселок Першаи, где уровень радиации выше 15 кюри на квадратный километр, Налибокская пуща во многих местах "запорошена" радиацией, под Борисовом есть "черные пятна", где нежелательно собирать грибы, ягоды. Но люди об этом забывают.

— А может, мы драматизируем ситуацию? Ведь есть доклад международных экспертов, который свидетельствует, что последствия чернобыльской трагедии для здоровья людей, потерпевших от аварии, были незначительными...

— Этот доклад был подготовлен на 20-летие чернобыльской аварии и включал в себя данные за период примерно 15—17 лет после трагедии. Хотел бы отметить, что последствия атомной бомбардировки в Хиросиме и Нагасаки японцы изучали на протяжении 60 лет, причем наблюдали всех, кто остался в живых, а это 120 тысяч человек. Только спустя 50 лет были опубликованы данные, которые свидетельствовали, что всплеск лейкемий случился через 5—7 лет после бомбардировки, а рост других злокачественных новообразований начался через 20 лет и наблюдался вплоть до 40-летнего периода времени. Поэтому можно говорить о том, что выводы, которые были сделаны международными организациями спустя 20 лет после чернобыльской трагедии, поспешные. Тогда эффектов других злокачественных новообразований просто еще не было. Они начинают проявляться только спустя 15 лет после трагедии и могут быть статистически выверенными еще через 15—20 лет. Поэтому сегодня отдаленные эффекты Чернобыля мы только начинаем наблюдать. Проблемы спустя 25 лет после аварии не решены, хотя не только международные эксперты, но и некоторые представители Беларуси любят говорить, что никакой опасности Чернобыль больше не несет и жить можно спокойно. Исследования, несомненно, нужно продолжать, учитывая фундаментальный японский опыт. Но нужно понимать, что последствия Чернобыля — это не только белорусская проблема. Ее последствия представляют интерес для всего человечества. К сожалению, интерес зарубежных ученых упал. Многие из них занимают наблюдательную позицию — вы изучайте, а мы будем критиковать: и то не так сделали и это не так сравнили. Хотите иметь достоверную информацию — вкладывайте средства, и будем вместе анализировать данные.

— Алексей Евгеньевич, когда вы говорите о росте числа раковых заболеваний в Беларуси, то ваши визави тут же отвечают: такая же картина наблюдается во всем мире.

— Безусловно, проблема эта чрезвычайно сложная. Чтобы сделать правильные выводы, ответить однозначно, какие формы рака зависимы от радиации, какие нет, необходимо грамотное исследование. Проводить его в Беларуси было чрезвычайно сложно. После аварии огромное количество людей мигрировало из загрязненной зоны, из сел в города, и это мешало правильному подбору групп сравнения. Для того чтобы судить о медицинских последствиях Чернобыля, достаточно было бы сравнить две группы населения — облученных и необлученных. Но в регистре есть только те, кто пострадал от радиации. И мы были вынуждены сравнивать их со всем остальным населением, среди которого могли быть и те, кто тоже получил дозу облучения. И второй момент — деньги. Для такого массового обследования необходимо соответствующее финансирование. Например, чернобыльский белорусско-американский проект стоит 450 тысяч долларов в год, и это деньги, которые тратятся только на обследование 10—12 тысяч детей. Этот проект был начат 15 лет назад и продолжается по сей день, обследуются люди, которые были детьми на момент аварии, для выявления патологии щитовидной железы. Такие исследования называются когортными, и они очень затратны из-за необходимости тщательного обследования больших групп людей на протяжении длительного периода. Для правильных заключений о длительном действии малых доз радиации нужны именно такие исследования.

Но, тем не менее, есть данные, с которыми трудно поспорить. Например, однозначно доказана зависимость роста рака щитовидной железы от чернобыльской аварии. Через четыре года после аварии, в 1990 году, появились первые случаи рака щитовидной железы в Беларуси, через два года всплеск заболевания наблюдался у наших соседей — в Украине и России. Пик пришелся на 2002—2003 годы, рак диагностировали чаще всего у детей. Чернобыльские дети выросли, но риск заболеть остается. Доказано, что те, кому на момент аварии было от 0 до 18 лет, сегодня имеют риск заболеть раком щитовидной железы в 15 раз больше, чем остальное население.

Самые последние исследования ученых Гомельского центра радиационной медицины и экологии человека показывают превышение онкозаболеваемости среди групп наиболее пострадавшего населения (ликвидаторов и лиц, проживающих на территориях с высокой плотностью загрязнения), чем среди тех, кто не подвергся радиоактивному облучению. Исследования показывают, что спустя 20—23 года после аварии среди них увеличился относительный риск заболевания раком ободочной кишки. Достоверно возросла частота новообразований кожи. Особенно среди женского населения. Растет заболеваемость раком мочевыводящих путей, что тоже вполне объяснимо: радионуклиды, попадающие в организм, выводятся с мочой. Появились данные, что частота лейкозов увеличилась у ликвидаторов-мужчин. Если сделать сравнение по всем видам злокачественных новообразований, то в целом заболеваемость раком среди изученных групп пострадавшего населения на 12% больше, чем среди тех, кто не подвергся радиоактивному облучению. Важно отметить, чтобы не пугать людей, что это не все население, а только группы, подвергшиеся наибольшему воздействию. Сегодня во всех населенных пунктах доза внешнего облучения не превышает 1 мЗв в год. Но остается риск внутреннего облучения за счет молока с личных подворий и продуктов питания, особенно даров леса.

— Последнее время появляются заявления, что следствием чернобыльской аварии стал и рост рака молочной железы. Что скажете по этому поводу?

— Дискуссии вокруг того, влияет ли воздействие радиации на возникновение и частоту рака груди, шли долго. Несколько лет назад выполнялся международный проект с участием белорусских и украинских ученых. Было проведено большое исследование, в которое удалось включить значительное количество женщин из Беларуси и Украины. Это исследование позволило выявить достоверное увеличение относительного риска заболеваний раком молочной железы у женщин, которые проживали на территориях с высокой плотностью загрязнения радионуклидами и которые получили дозу облучения от 40 миллизиверт и выше. При меньших дозах эффекты не обнаружены.

— Недавно в Минске прошла немецко-белорусская конференция "25 лет после Чернобыля". В своем выступлении представитель международной организации "Врачи мира по предотвращению ядерных войн" Ангелика Клаузен заявила, что исследования, которые проводятся в различных центрах России, Украины и Беларуси, свидетельствуют о том, что рост очень многих заболеваний, не только онкологических, связан с Чернобылем.

— Мы давно обращали внимание на тот факт, что когда была установлена связь с чернобыльской аварией роста рака щитовидной железы и все активно включились в эти исследования, за рамками внимания остались другие заболевания щитовидной железы. Такие, как гипотиреозы, узловые формы зоба. А их количество в десяток раз превышает количество раковых заболеваний.

Что касается других соматических заболеваний, то с ними разобраться тяжелее. Хотя многочисленные исследования наших врачей и международных экспертов показывают, что есть ряд заболеваний, которые могут быть связаны с воздействием радиации, в том числе гипертоническая болезнь, сердечно-сосудистая патология, сахарный диабет. К слову, госпожа Клаузен ссылалась на российские исследования, авторы которых утверждают, что воздействие радиации приводит к расстройству оксидантной системы, последствием чего становится преждевременное старение клеток. Быстро стареют кровеносные сосуды, что приводит к инфарктам, атеросклерозам, поражению центральной нервной системы, происходит потеря интеллекта, особенно у детей. Вместе с тем все это требует серьезной проверки, поскольку у этих заболеваний множество других факторов риска.

— Алексей Евгеньевич, как вы считаете, достаточно ли обследованы белорусы?

— Думаю, что да. Для этого есть условия, выделяются средства. Все зависит от людей, от их отношения к собственному здоровью. Например, ликвидаторы должны обследоваться в обязательном порядке, но многие игнорируют посещение врачей.

— Вы считаете, что чернобыльские исследования надо продолжать?

— Безусловно. У нас есть две наиболее распространенные точки зрения и поведения: одни стараются сказать, что белорусы умирают из-за Чернобыля, другие — что ничего страшного не произошло. Хуже всего, когда это происходит из корпоративных интересов защиты ядерной энергетики. Но ее не нужно защищать, потому что человечество и так вряд ли от нее откажется в ближайшее время. Это как с автомобильным транспортом: если посмотреть на количество погибших от автомобильных катастроф, то увидим, что оно намного превышает число погибших в результате чернобыльской катастрофы. Однако человечество не спешит отказаться от машин. Так же и с атомной энергетикой. Мы должны констатировать, что альтернативные источники энергии в быстром времени не смогут ее заменить. Но надо научиться безопасно пользоваться тем, что люди разработали. И надо знать всю правду об атоме, чтобы принимать адекватные решения по организации профилактики, лечения и защитных мероприятий. И когда мы говорим об итогах чернобыльской катастрофы, то должны тщательным образом изучить ее последствия, чтобы найти золотую середину, которая поможет нам стать умнее.

Мария ЭЙСМОНТ.

Самый большой в Беларуси ветряк выработал первые мегаватты электроэнергии

Первая в Беларуси ветроэнергетическая установка мегаваттного класса заработала в режиме пусконаладки. Об этом корреспонденту БЕЛТА сообщил главный инженер филиала "Лидские электрические сети" РУП "Гродноэнерго" Виктор Сороко.

Ветроэнергетическая установка мощностью 1,5 МВт разместилась в поселке Грабники Новогрудского района. Проект реализуется с участием китайской компании HEAG, которая поставила оборудование для ВЭУ. Среднегодовая выработка электроэнергии установкой в Новогрудском районе составит примерно 3,8 млн кВт·ч, что соответствует экономии условного топлива около 1,1—1,25 тыс. тонн. Общая стоимость проекта оценивается в 8—9 млрд белорусских рублей.

Монтаж установки уже завершен. Длина каждой из трех лопастей ветроколеса составляет около 40 м, высота мачты — примерно 90 м. Вес оборудования — около 200 тонн. В настоящее время на установке проводятся пусконаладочные работы, которые продлятся до конца недели. Китайские специалисты осуществляют шефмонтаж, а белорусские — технический надзор.

Ветроустановка уже выработала первые мегаватты сопутствующей электроэнергии. Ожидается, что в полную силу она заработает в конце апреля — начале мая. Дата запуска ветряка в промышленную эксплуатацию зависит в первую очередь от погоды. Чтобы установка работала на полную мощность, скорость ветра должна быть не ниже 5—6 метров в секунду. Вместе с тем ВЭУ начинает производить электроэнергию уже при скорости гораздо ниже этой.

По результатам обследования площадки в районе деревни Грабники в дальнейшем здесь возможно размещение ветропарка из семи-восьми ветроэнергетических установок. Суммарная ориентировочная среднегодовая выработка электроэнергии такого ветропарка составит около 25—30 млн кВт·ч.

РАЗВІТАННЕ

Памерла мама Зміцера Дашкевіча

Сэрца Вольгі Дашкевіч спынілася ўноч на 26 красавіка. Ёй было ўсяго 54 гады.

Бацькі Зміцера Дашкевіча пражылі разам 32 гады. Гэтую дату яны адзначылі два тыдні таму. Абодва працавалі журналістамі. Сям'я шмат вандравала. Зміцер нарадзіўся на Гомельшчыне, потым Дашкевічы пераехалі на Далёкі Усход у Магаданскую вобласць. А праз пяць год вярнуліся ў Беларусь, пасяліліся ў Старых Дарогах (Мінская вобласць). У Дашкевічаў сціплая двухпакаёўка.

Апошнія месяцы Вольга Дашкевіч моцна перажывала за сына, кепска сябе адчувала, з-за чаго не змагла прыехаць на суд.

Вольга і Вячаслаў Дашкевічы.

Адамовічу свеціць тры з паловай гады калоніі

У судзе Цэнтральнага раёна Мінска дзяржаўны абвінаваўца папрасіў адправіць кіраўніка ўпраўлення па расследаванні злачынстваў Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю Дзмітрыя Адамовіча на тры гады і шэсць месяцаў у калонію ўзмоцненага рэжыму.

Таксама дзяржабвінаваўца патрабуе пазбавіць Адамовіча права займаць адпаведныя пасады тэрмінам на 5 гадоў. Нагадаем, што падпалкоўніка фінансавай міліцыі Д.Адамовіча абвінавачваюць у здзяйсненні злачынстваў супраць інтарэсаў службы. Сваю віну ён не прызнае. З апошнім словам Дзмітрый Адамовіч выступіць у судзе 6 мая.

Марына КОКТЫШ.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Ці асудзілі «чорных трансплантолагаў»?

"У мінулым годзе ў інтэрнэце краем вока бачыла інфармацыю пра тое, што беларусаў вывозілі за мяжу з мэтай незаконнага атрымання органаў для трансплантацыі. Колькі нашых грамадзян пацярпела? І ці быў ужо суд па гэтай справе?

Вольга ЧАБАН, Бараўляны, Мінскі раён".

Сапраўды, напрыканцы мінулага года Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі ўзбудзіла крымінальную справу па артыкуле "Гандаль людзьмі з мэтай вынятку органаў і тканак для трансплантацыі".

Як паведамілі нам у Міністэрстве ўнутраных спраў, сярод пацярпелых — трое беларусаў.

Фігуранты крымінальнай справы "чорных трансплантолагаў" былі затрыманы на тэрыторыі Украіны, дзе ў дачыненні да іх была ўзбуджана аналагічная крымінальная справа (у спісе ахвяр таксама шмат украінцаў). Паведамлялася, што сабраныя беларускімі праваахоўнікамі матэрыялы будуць перададзены ўкраінскім следчым.

Вядома, што тых, хто пагаджаўся прадаць свае органы, вывозілі ў Косава, Эквадор і Украіну. Прычым, як пісалі некаторыя інтэрнэт-выданні, донары выязджалі за мяжу добраахвотна, аднак у стаўленні да іх ужываліся розныя метады псіхалагічнага і фізічнага ўздзеяння, у тым ліку пазыковая залежнасць. За вынятую нырку кожнаму "добраахвотніку" належала плата ў памеры 10 тысяч долараў ЗША. Але некаторыя пасля хірургічнага ўмяшальніцтва атрымлівалі толькі частку абумоўленай сумы...

Варта адзначыць, што расследаванне па гэтай справе яшчэ не скончылася і таму прадстаўнікі МУС Беларусі не вельмі ахвотна расказваюць пра ўсе падрабязнасці.

"Мы не даём лішняй інфармацыі ў прэсу, каб не нашкодзіць самім сабе, каб усё нармальна расследаваць і давесці справу да суда", — сказаў "Народнай Волі" намеснік кіраўніка другога аддзела Упраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі **Уладзімір Емяльянаў**.

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
29 КРАСАВІКА—5 МАЯ 2011 г.

РОЗДУМ

Ці не сорамна спяваць пад чужую дудку?

Тэлеканал АНТ прадставіў гледачам, як абвясцілі вядучыя, "самое главное шоу года" пад назвай "Я пою". Па словах яго арганізатараў, ставілася мэта не толькі зрабіць музычнае відовішча, а і падштурхнуць гледача задумацца над перспектывамі юных талентаў на шляхах нашай культуры.

Але якую культуру сее на беларускай ніве АНТ? Калі забыцца, што ты беларус і што жывеш у Беларусі, то шоу "Я пою", бадай, не горшае за любую шоу-папсу ў Расіі. Стваральнікі гэтай дзеі, на маё ўспрыманне, паказалі сваю самадастатковасць і прафесіяналізм. Толькі, упэўнены, не трэба ім у сваёй творчасці ўвесь час азірацца на Маскву. Шукайце смела сваё, адметнае, непаўторнае! Вы — у сваёй хаце, дык вылазьце з-пад лаўкі і сядайце, як сапраўдныя творцы і гаспадары. Барані Божа, я зусім не заклікаю да абасобленасці, абмежаванасці. Трэба бачыць і цаніць здабыткі культуры ўсіх народаў свету, але, не маючы ўласнага голасу, ты не будзеш нікому цікавы.

Я стаўлю пытанне перад кіраўнікамі і ўсім чынавенствам сферы культуры і, канечне ж, самімі творчымі асобамі: кампазітарамі, артыстамі-салістамі, педагогамі. Вам, скажыце, не сорамна перад беларускім народам, што вучыце дзяцей спяваць выключна пад чужую дудку? За тры суботнія вечары на "шоу года" з вуснаў сапраўды таленавітых нашых дзетак не прагучала ніводнай, ніводнай песні на беларускай мове. Ці можаце вы ўявіць, што падобныя шоу ў Расіі цалкам пазбаўлены рускай мовы, у Літве — літоўскай, у Польшчы — польскай, ва Украіне — украінскай і г.д.? Правільна думаеце: не. Такое проста немагчыма, дзіка, не па-людску. А расіянін на такое пытанне проста скажа: "Ты что, с ума сошел?" (такія эксперыменты я праводзіў, можаце і самі правесці). І будзе мець рацыю. Як жа можна дзяцей-сірот асірочваць другі раз, пазбаўляючы іх роднай мовы?

Творцы сучаснай беларускай культуры, чаму вы так сябе не паважаеце, дзе ваш здаровы прафесійны і нацыянальны гонар? Няўжо ў Беларусі няма сваіх кампазітараў, якія б не здраджвалі свайму, роднаму?

Хто аспрэчыць, што для любога чалавека, асабліва дзіцяці, самая прыгожая і мілая з жанчын — свая родная маці? Яна адна Богам дадзеная чалавеку. Гэтаксама і мова адна, як і Радзіма. Менавіта трыяда — мама, мова, Радзіма — ёсць духоўнае апірышча чалавека, без якога ён не адбываецца як асоба, як грамадзянін сваёй Краіны, як патрыёт Бацькаўшчыны. Знішчэнне любога складніка з гэтай трыяды разбурае асобу, робіць яе рабска-халуйскай, інтэлектуальна ўбогай і нікчэмнай.

Выяўляць і развіваць юныя таленты ў Беларусі трэба на тысячагадовым нацыянальным, самабытным грунце, а не на чужых шлягерах. Спевакі, уганараваныя званнямі "заслужаны" ці "народны", а таксама маладыя, задумайцеся аб сваім месцы, аб вашай адказнасці ў адраджэнні мастацкіх скарбаў Радзімы, аб ролі мастацтва ў выхаванні беларусаў. У першую чаргу — мастацтва нацыянальнага. Згадайце хаця б прыклад выдатнага спевака з сусветным імем М.І.Забэйду-Суміцкага, які і ў далечыні ад Бацькаўшчыны верна служыў ёй сваім талентам і любоўю.

Прызнацца, мне шкада здольную дзяўчынку Ксенію Сітнік, шкада іншых вучняў таленавітага майстра-педагога Святланы Стацэнка, якая, відаць, па нейкім уласным неразуменні трымае сябе і сваіх выхаванцаў у абцугах расійскай папсы і не адчувае адказнасці перад беларускай песеннай культурай. Гэта проста невытлумачальна — спяваць увесь час з чужога голасу, пад чужую дудку і не бачыць, што гэта — шлях у тупік.

Мікола САВІЦКІ,
прафесар,
дзядуля трох унучак.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Падкажыце, калі будуць судзіць Ірыну Халіп і Мікалая Статкевіча? Хачу прыйсці ў суд іх падтрымаць

Ірына ПІНЕВІЧ,
Мінскі раён.

Уса, Статкевіча і Халіп будуць судзіць 11 мая

Суд над экс-кандыдатамі ў прэзідэнты Мікалаем Статкевічам і Дзмітрыем Усам пачнецца 11 мая ў 10.30 у Ленінскім раённым судзе Мінска.

Весці працэс будзе суддзя Людміла Грачова. Дзмітрый Ус, як і вязень турмы КДБ Мікалай Статкевіч, абвінавачаны ў арганізацыі масавых беспарадкаў 19 снежня. Ім пагражае да 15 гадоў зняволення. Падчас следства Дзмітрый Ус адмовіўся, як прапаноўваў, паводле ягоных звестак, следчы, агаворваць Мікалая Статкевіча. 11 мая ў судзе Заводскага раёна сталіцы пачнецца працэс над Паўлам Севярынцам, Ірынай Халіп і Сяргеем Марцалевым.

ВІНШУЕМ!

Гарачае сэрца

Васілю Якавенку — 75!



Мы з Васілём Цімафеевічам — землякі, хоць доўгі час і не былі знаёмыя. Абодва родам з палескай глыбінкі, і паміж нашымі вёскамі было ўсяго некалькі кіламетраў. Як потым высветлілася, бацькі нашы былі добра знаёмыя між сабою яшчэ ў даваенныя часы. Добра ўяўляю, якія жахі давялося перажыць Васілю і яго сям'і ў гады ваеннага ліхалецця, якія цяжкасці пераносіць у першыя мірныя гады, калі людзі радаваліся кавалку хлеба, а кубак малака здаваўся раскошай. Дзеці тады хутка сталелі, падстаўлялі пад агульную ношу свае неакрэплыя плечы.

Усё гэта спаўна зведаў на сабе будучы пісьменнік, з якім мы, яшчэ не знаёмыя, вучыліся разам у былым Васілевіцкім раёне былой Палескай вобласці. І калі праз гады пачаў сустракаць яго творы ў асобных выданнях (а гэта былі "Зямля, адкрытая намі", "Пакуль сонца ў зеніце" і іншыя), адчуў радаснае ўзрушэнне: гэта ж — жыццё, не прыдуманае, але прапушчанае праз мастакоўскае бачанне творцы.

Нарэшце, адбылося наша асабістае знаёмства пасля таго, як з "Народнай Волі" даведаўся пра выхад з друку рамана Васіля Якавенкі "Надлом" і прачытаў саму кнігу. Месца дзеяння ў рамане — вядомае на ўсю Беларусь мястэчка Моталь на Брэстчыне, дзе я мноства разоў бываў, ведаў яго гісторыю, людзей, звычаі: мая ж жонка родам з Моталя, і мы з ёю ведаем многіх персанажаў гэтага твора.

І зноў я быў уражаны і ўсхваляваны: героі і падзеі настолькі перакананўчыя і пазнавальныя, нібы не на старонках кнігі, а ў рэальнасці ты сустракаеш сваіх знаёмцаў, заглыбляешся ў іх побыт і душы, захапляешся працалюбствам і талентам гэтых простых людзей, іх сялянскай упартасцю і нязменнай прагай да справядлівасці, лепшай долі на вольнай зямлі ў вольнай Беларусі.

Якая ж спатрэбілася пісьменніцкая праца для заглыблення ў гісторыю мястэчка і ўнутраны, багаты і складаны свет сваіх герояў, каб праз іх па-мастацку асэнсаваныя вобразы прасвечваліся гісторыя і лёс усёй Беларусі з яе пакутніцкім, цярністым шляхам у будучыню.

Не толькі я, але, ведаю, і многія іншыя чытачы, віншуючы Васіля Цімафеевіча з новым творчым поспехам, выказвалі жаданне, каб ён працягваў працу ў гэтым кірунку, асвятліў разгортванне падзей, хаду гісторыі ў апошнія дзесяцігоддзі XX веку, калі адбывалася станаўленне Беларусі як незалежнай дзяржавы.

На шчасце, нашы пажаданні супалі з творчымі намерамі пісьменніка, і праз колькі год убачыла свет яго гістарычная трылогія "Пакутны век". На мой погляд (зноў-такі, не толькі мой), мы атрымалі, можна сказаць, эпахальны твор, роўны якому цяжка адшукаць у беларускай літаратуры па маштабным ахопе таго, што адбывалася з нашай Радзімай, з беларусамі на зломе эпох, падчас знакавых падзей. І ўсё гэта — у мастацкім слове, якое надзейна абапіраецца на вывераныя гістарычныя дакументы. Спатрэбілася скалясіць мноства даро па краіне і ў замежжы, вывучыць мноства архіўных матэрыялаў, сустракацца з мноствам людзей — будучых герояў новай кнігі, немалы час жыць сярод мотальцаў, слухаючы іх каларытную гамонку, дзівячыся іх жыццяўстойлівасці і адметнаму творчаму дару, улоўліваючы голас самой зямлі і самога часу, каб увасобіць у трылогіі драматызм Беларускага шляху да запаветнай мары, да якой яшчэ ісці і ісці. Чытаеш гэтую кнігу — і не можаш быць абыякавым: маўляў, усё гэта дзесьці там, ззаду, за смугой гадоў. Ну, было і сплыло... Не, не і яшчэ раз не! Міжволі раскалыхваюць душу і думкі гэтыя старонкі з-пад пяра нераўнадушнага творцы, міжволі ты задаешся неадчэпным настойлівым пытаннем: а што ж далей, калі скончыцца для Беларусі яе пакутніцкі век? І што дзеля гэтага можаш, абавязаны ўласным сумленнем, зрабіць ты сам?

Васіль Якавенка сваёй творчасцю прымушае кожнага думаць пра лёс краіны, пра тое, якой пакіне яе сваім дзецям, унукам і праўнукам. Яго творы заслугоўваюць таго, каб шырока выдавацца ў Беларусі, перакладацца на многія мовы свету.

Чалавек, які не баіцца выказваць праўду паўсюль і заўжды, заслугоўвае павагі і ўдзячнасці. Чалавек, які гэта робіць таленавіта і перакананўча, заслугоўвае народнага прызнання. І з гэтым ад усёй душы мы можам павіншаваць вельмішаноўнага юбіляра. Трымаю ў руках яго нядаўна выдадзеную кнігу публіцыстыкі "Нячывелле" — і радуюся пісьменніцкай неўтаймаванасці аўтара, яго нязводнаму грамадзянскаму імпэту, чалавечай мужнасці гаварыць праўду. Праўда і ёсць галоўным героем яго кніг, і аб чым бы Васіль Якавенка ні пісаў, бачыш: пісьменнік — адданы патрыёт Беларусі, яе сын з гарачым, неспакойным сэрцам.

Я ганаруся сваім земляком. Не верыцца, што яму 75. А верыцца, што яшчэ не раз сустрэнемся з яго новымі кнігамі, якія стануцца падзеяй для нацыянальнай культуры. І таму, віншуючы з паважанай вехай, жадаю аднаго — добрага здароўя, многіх год напярэдадзе і нестарэючага жадання штодня брацца за пяро.

Уладзімір ЗАЯЦ,
жыхар г.Скідзеля
Гродзенскай вобласці.
Фота
Яўгена ЗАЛУЖНАГА.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Дзе працуе Сяргей Скрабец?

Паважаная "Народная Воля"! Распавядзіце, калі ласка, чым зараз займаецца былы дэпутат і бізнесмен Сяргей Скрабец? Апошнім часам пра яго ўвогуле нічога не чуваць... Можа, Скрабец з'ехаў з Беларусі?

Ігар СКУРАТОВІЧ, Мінск.

— Я жыву ў Мінску, — адказаў на пытанне "Народнай Волі" Сяргей Скрабец. — Паколькі я па-ранейшаму актыўна шукаю працу, то асвоіў шмат новых спецыяльнасцяў: дворнік, лазеншчык, грузчык. Карацей, цяпер я самы сапраўдны спецыяліст шырокага профілю. Зараз працую кур'ерам — развожу па Мінску розныя тавары. Так што калі трэба нешта падвезці — звяртайцеся, калі ласка. Аднойчы, дарэчы, прыехаў на заказ, а дзверы адчыняе замежнік. Я пагаварыў з ім на англійскай мове, а ён так здзіўлена пытаецца: у вас усе кур'еры па-англійску размаўлюць? Так, кажу, у нас такая прасунутая краіна...

Але афіцыйна я не працаўладкаваны. Па законе аб статусе дэпутата мяне абавязаны былі працаўладкаваць, ну, я сунуўся ў пару месцаў, але там ледзь не пад стол хаваліся, калі я прыходзіў...

Яшчэ на Трактарны хадзіў у ліцейку — я ж металург. Але там таксама адмовіліся мяне прыняць на працу, сказалі: яшчэ не туды рабочых завядзеш. Быццам бы рабочыя так за мной і пайшлі!

На біржы працы таксама стаяў. Выніку — ноль. Цяпер чакаю, калі ў Беларусі наступяць часы, у якія будуць запатрабаваны разумныя людзі...

Нагадаем, што ў свой час Сяргей Скрабец атрымаў званне "Лепшы прадпрымальнік Беларусі".

Марына КОКТЫШ.

НА ЗАМЕТКУ...

Чем полезен березовый сок?

Один мой знакомый спортсмен постоянно пьет березовый сок. Говорит, что он очень полезен. Это действительно так?

Виктор ПРОКОПЕНКО, г.Слуцк.

Березовый сок, или березовица, как его называют в народе, — очень ценный продукт, оказывающий благотворное влияние на весь организм человека.

Точный период выделения березового сока установить трудно, потому что оно зависит от погодных условий. Например, если во время мартовской оттепели сок уже начал течь и неожиданно ударили морозы, он может на какое-то время прекратить выделяться. Однако, как правило, сок начинает бежать, когда тает снег и набухают почки, примерно в середине марта. Собирать сок прекращают, когда уже распускаются листья, во второй половине апреля.

Собирать "березовые слезы" нужно только в экологически чистых лесах, потому что дерево способно впитывать вредные вещества и выхлопные газы. Лучше всего выбрать березу, диаметр которой не меньше 20 см, с хорошо развитой кроной. На расстоянии 20 см от земли в стволе дерева аккуратно проделывают маленькое отверстие. Важно знать, что в основном сок идет в поверхностном слое между корой и древесиной, поэтому глубокую дырку делать совсем не нужно. В сделанное отверстие или под ним прикрепляют лоток из бересты или другое полукруглое приспособление, по которому будет стекать сок. Желобок должен быть направлен в бутылку, банку или пакет.

Лучшим временем для сбора сока считается промежуток между 12 и 18 часами, когда он течет наиболее сильно. От диаметра дерева зависит количество отверстий, которые можно сделать: если 20—25 см — то только одно, при объеме 25—35 см — два, при 35—40 — три, а если диаметр более 40 см — допустимо сделать четыре отверстия.

После того как соберете сок, не забудьте помочь дереву выздороветь: нужно туго закрыть отверстие воском, пробкой или мхом, чтобы в ствол не попали бактерии, которые могут нести серьезную угрозу для жизни дерева. Хранить березовый сок можно в холодильнике чуть более 2 суток.

Медицинские исследования показали, что прием хотя бы одного стакана в день в течение 2—3 недель (оптимально выпивать три раза в день по стакану за полчаса до еды) поможет организму справиться с весенней слабостью, авитаминозом, рассеянностью, усталостью и депрессией. Противопоказан березовый сок тем, у кого аллергия на пыльцу березы.

В березовом соке содержатся органические кислоты, дубильные вещества, минеральные вещества, железо, калий, кальций, глюкоза, фруктоза, фитонциды. Употребление березового сока способствует расщеплению камней в мочевом пузыре и почках, очищению крови, усилению обменных процессов. Полезно пить сок и при язве желудка, заболеваниях печени, двенадцатиперстной кишки, желчного пузыря, пониженной кислотности, радикулите, ревматизме, артрите, бронхите, туберкулезе, цинге, головной боли. К тому же березовый сок повышает сопротивляемость организма к простудным, инфекционным и аллергическим заболеваниям, оказывает глистогонное, мочегонное, противоопухолевое действие. Также соком березы полезно протирать кожу при экземах, угрях, для увлажнения и очищения сухой кожи. Очень хорошо нанести на кожу лица следующую маску: смешать 1 ст. л. сметаны с 2 ст. л. березового сока и 1 ч. л. меда. Держать такую маску нужно около 15 минут, смыть прохладной водой, кожа после нее приобретет красивый матовый оттенок.

А еще березовым соком полезно мыть волосы при перхоти, для усиления их роста и появления блеска и мягкости (тем же свойством обладает настой березовых листьев).

Чтобы сохранить березовый сок, из него готовят квас: нагревают до 35 градусов, добавляют по 15—20 г дрожжей и 3 изюминки на 1 литр, по вкусу можно добавить лимонную цедру. После этого банку или бутылку плотно закрывают и оставляют на 1—2 недели. Получится очень вкусный, газированный, бодрящий напиток!

Квас можно приготовить несколько по-другому: к 10 л березового сока добавляют сок 4 лимонов, 50 г дрожжей, 30 г меда или сахара, изюм из расчета 2—3 штучки на бутылку. Разлить по бутылкам и держать 1—2 недели в темном прохладном месте. В описанных выше случаях квас может быть готов уже через 5 дней, но от того, что он простоит дольше, напиток не испортится: его можно сохранить на все лето.

Наши предки пили березовицу и перебродившей в бочках без добавления сахара — это был традиционный слабоалкогольный напиток на застольях. Можно настаивать березовый сок на сухофруктах, в банке, прикрытой марлей, тоже примерно 2 недели. А еще можно добавлять в "березовые слезы" сок ягод, настаивать их на травах. В общем, используйте на здоровье этот замечательный весенний подарок природы!



МУЖСКОЙ ВЗГЛЯД

«Я свою Наталию узнаю по талии...»

Тонкая талия — предмет особого внимания девушек и женщин.

"Я свою Наталию узнаю по талии" — в этой употребляемой подчас мужчинами поговорке улавливается очень широкий спектр оттенков: и гордость, и восторг, и ирония, и снисходительность, и грусть — словом, всего и не перечислишь...

Конечно, все эти интонации довольно точно отражают состояние талии той, о ком заходит разговор. Безусловно, каждой девушке, женщине очень хотелось бы, чтобы о ее талии отзывались с восхищением. Отсутствие излишних жировых отложений в области живота, бедер, спины создает ощущение грациозности, женственности и изящества. Поверьте, любые причуды моды не смутят обладательниц тонкой талии. Именно поэтому талия — предмет особого внимания женщин!

Пропагандируя методы атлетизма как надежный способ коррекции любой части тела и фигуры в целом, сегодняшний разговор я хочу начать тем не менее не с атлетических упражнений.

Каждая женщина наверняка не понаслышке знает, что такое диета. Многие пытались сделать свою фигуру красивой с помощью разнообразных диет. Знаю таких много... И большинство, безрезультатно отдав этим диетам дань, вернулись к обычному питанию.

Однако надо знать, что любые тренировки не дадут желаемого результата, если разумно не ограничивать себя в еде. Главное, отказаться от жирных, сладких блюд. Чаще употреблять мед, ведь в каждой его ложке бочка пользы! Старайтесь по возможности есть простую, натуральную пищу, в которой всегда есть место овощам и фруктам, тогда и тренировки пойдут вам на пользу. Не забывайте посоветоваться с лечащим врачом. Обязательно!

А теперь несколько простых упражнений, которые можно выполнять, даже сидя на стуле, на табуретке. Это наклоны туловища вперед, назад, вправо, влево и круговые вращения. Делать по 15—20 повторений 3—4 раза в день. При этом найдите время и для прогулок, бега, танцев и, конечно, для занятий любовью! Все это поможет за 2—3 месяца вашу талию уменьшить на 5—6 сантиметров. Только выполняйте мои рекомендации с душой...

С уважением —

Юрий ЯСИНСКИЙ,
ветеран труда,
заслуженный тренер
БССР.

Могут ли отдать права раньше срока?

Меня лишили водительских прав за вождение в нетрезвом виде. Возможно ли сокращение срока лишения?

Игорь ПЕТРОВСКИЙ,
Минская область.

Нет, такая возможность законом не предусмотрена, сообщает сайт МВД Беларуси. Строгость наказания в данном случае полностью соответствует вине.

РЭХА ТРАГЕДЫІ

Чаму не прад'яўляюць абвінавачанні?

Не разумею, чаму дагэтуль тым, каго падазраюць у арганізацыі выбухаў у метро, дагэтуль не прад'яўлены абвінавачанні. Аляксандр Лукашэнка сказаў, што тэракт раскрыты, злодзеі знойдзены, і справу трэба хутчэй накіраваць у суд.

Літаральна днямі з экранаў БТ міністр унутраных спраў Анатоль Куляшоў адказваў на пытанні журналістаў па гэтай тэме. І генерал таксама не ўдакладніў тэрмінаў прад'яўлення затрыманым абвінавачання. Сказаў, што гэта будзе зроблена тады, калі будуць сабраны ўсе доказы. І што ў СІЗА, маўляў, проста так ніхто нікога трымаць не будзе.

Вось я і не разумею, як так можа быць: адзін кажа, што справа раскрыта, а другі — што яшчэ няма ўсіх доказаў...

Марыя ПУШ,
Мінск.

ПЫТАННЕ—АДКАЗ

Што з «гомельскімі тэрарыстамі»?

Пасля трагічных падзей у Мінску ўспомнілася мне інфармацыя, якая была распаўсюджана СМІ ў лютым мінулага года. Можа, хто і не звярнуў на яе ўвагі, а ў мяне ў Гомелі дачка жыве — дык я аж уздрыгнуўся, калі прачытаў.

Гомельские правоохранительные органы проводят проверку по факту задержания шести человек в канун нового, 2010, года. По словам начальника управления внутренних дел Могилевского облисполкома Федора Болейко, 31 декабря в Гомеле группа злоумышленников планировала совершить террористический акт — взрыв. *"Все они арестованы — это шесть человек. Трое из Бобруйска. В одной из квартир и на даче мы нашли большое количество компонентов взрывчатых веществ. Это дело требовало специальной подготовки и специального оборудования. Должна была быть холодильная какая-то еще установка, ведь там же лили тротил, использовали различные медицинские препараты",* — сказал Федор Болейко.

Чым скончылася тая справа? Чаму тэма магчымага тэракта на новы, 2010, год у абласным цэнтры ўвогуле была замоўчана?

Іван САЎЧАНКА, Жлобін.

Сапраўды, была такая гісторыя. Пра вынікі якой, праўда, пісалі толькі спецыялізаваныя міліцэйскія выданні накшталт часопіса "Спецназ". Магчыма, каб не турбаваць лішні раз людзей, не разбураць імідж Беларусі як спакойнай і стабільнай дзяржавы. Але, не выключана, што не пісалі СМІ пра тую спецаперацыю і з наступнай нагоды: высветлілася, што ніякай групы тэрарыстаў у Гомелі не было.

Хаця за тое, што выбухавікі-самадзелкіна зловілі і правучылі, міліцыянерам трэба сказаць дзякуй.

31 снежня 2009 года, калі ўся краіна накрывала святочныя сталы, байцам гомельскага спецназа з абласнога ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачынасцю паступіла незвычайнае заданне: затрымаць падазронага ў падрыхтоўцы тэракта. У спакойным Гомелі на Новы год рыхтуецца тэракт — гэта, прама скажам, надзвычайная сітуацыя...

Каго там хапалі за кампанію, на сёння цяжка сказаць, але гісторыя галоўнага героя вельмі падобная на тую, якую мы чуем пра расследаванне выбуху ў мінскім метро.

Хлопец з дзяцінства захапляўся хіміяй, асабліва той яе часткай, якая дазваляла майстраваць тое, што гучна выстрэльвае і прыгожа гарыць. Скончыў школу, ПТВ, спецыяльнай адукацыі не атрымаў, але працягваў самастойныя эксперыменты па вырабе выбуховых пакетаў. Тэарэтычныя веды здабываў са спецыялізаванай літаратуры, неабходныя кампаненты — у магазінах гаспадарчых тавараў і аптэках. Знайшоў прымяненне нават пульту дыстанцыйнага кіравання ад цацачнай машынкі.

Палігонам для эксперыментаў стаў лясок ля вёскі Копань Рэчыцкага раёна, дзе жыла бабуля "гора-самадзелкіна". Час ад часу "радаваў" сваім "майстэрствам" родных — на дзень народзінаў бацькі неяк змайстраваў самаробную петарду. Майстраваў дымавыя шашкі, што гараць розным колерам, самаробныя феерверкі...

У снежні 2009 года хлопец зарэгістраваўся на адным са спецыялізаваных сайтаў пад нікам **barsuk** і падзяліўся на форуме сваёй задумай. "У мяне з'явілася ідэя, мабыць, не вельмі разумная, але... Хачу ўзяць плявалку на 25 выстралаў і засунуць у... Ну а потым усё гэта ў пяцілітровую баклажку з... Будзе спачатку маленькі, потым БУМ. Можа, на новы год замучу".

У часопісе для спецназаўцаў, які можна было купіць ва ўсіх беларускіх шапіках, дарэчы, прыводзіцца поўны "рэцэпт" гэтага "БУМ" — і ў якое рэчыва трэба змяшчаць такую петарду-плявалку, што там дзе адразаць, куды засоўваць і так далей. Але мы вырашылі не нагадваць пра гэты "рэцэпт" — ці мала ў краіне такіх "эксперыментатараў", яшчэ хто надумае паўтарыць?!

Як бы там ні было, але паведамленне не засталося без увагі супрацоўнікаў па расследаванні злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС. Арышт, вобыск, падчас якога літаральна ў спальні былі знойдзены хімічныя рэактывы, розныя прыстасаванні-мензуркі, слоічак з парашком, які аднесены да "ініцыіруючых выбуховых рэчываў". Але ніякіх доказаў, што сапраўды ў Гомелі на Новы год рыхтаваўся тэракт, знойдзена не было. Сам "тэрарыст" патлумачыў, што ён *"проста цікавіўся меркаваннем спецыялістаў, але ніякіх такіх планаў не меў"...*

Як вынік — тры месяцы арышту, пасля чаго суд хлопца выпусціў.

Ігар МАРОЗАЎ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
29 КРАСАВІКА—5 МАЯ 2011 г.

КОРОТКО

В Турции появится канал, соединяющий Черное и Мраморное моря

Об этом амбициозном плане, в преддверии июньских парламентских выборов, сообщил премьер Турции Реджеп Тайип Эрдоган. “Стамбульский канал”, именно так называется проект, позволит значительно разгрузить один из самых загруженных проливов в мире — Босфор. Канал, длина которого составит 45—50 километров, пройдет по европейской части Стамбула.

“*Однажды Стамбул станет городом двух морей*, — сказал Эрдоган. — *Согласно проекту, здесь появятся два полуострова и один остров*”. По словам Эрдогана, строительство канала должно завершиться к 2023 году. Глава кабинета не назвал точного месторасположения будущего пролива и не озвучил, сколько средств понадобится на его создание. Между тем уже сейчас специалисты называют проект одним из крупнейших в XXI веке.

Бывший президент признан виновным во взяточничестве

